# Жыццё як узор

**Цырымонія ўшанавання ў сувязі са 100-гадовым юбілеем ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза Васіля Мічурына адбылася ў Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**


Фота БЕЛТА.

Павіншаваць юбіляра прыйшлі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Качанава, памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па горадзе Мінску Аляксандр Якабсон, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр Румак, памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Аляксандр Гура, а таксама прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, маладзёжных рухаў.

Звяртаючыся да галоўнага героя ўрачыстасці, Наталля Качанава назвала мерапрыемства знакавай падзеяй у жыцці Беларусі. «Ваша жыццё з'яўляецца прыкладам самаахвярнай любові і адданасці свайму народу. Вы заўсёды былі прыкладам для пераймання. Прыміце падзяку ад нас за патрыятычнае выхаванне моладзі», — сказала віцэ-прэм'ер.

Васіль Сяргеевіч Мічурын нарадзіўся 28 ліпеня 1916 года. Палкоўнік у адстаўцы, легендарная асоба. Падчас Зімовай вайны ў Фінляндыі кулямётчык Мічурын у адзіночку на працягу некалькіх гадзін адбіваў атакі праціўніка. За гэты подзвіг яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Затым чатыры гады ваяваў на палях Вялікай Айчыннай вайны, атрымаў цяжкае раненне. У складзе Першага Беларускага фронту вызваляў родную зямлю, удзельнічаў у штурме Берліна.

■ Калі старонкі пажаўцелі...

# ЯК ЦЫВІЛІЗАВАНА РАССТАЦЦА СА СТАРЫМІ КНІГАМІ

**Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму за папулярнымі і рэдкімі кнігамі без перабольшвання «палявалі» — дастаць сапраўды вартае выданне было цяжка, да таго ж і каштавала такое задавальненне нямала. А сёння нярэдка даводзіцца бачыць жахлівую карціну — цэлыя стосы літаратуры знаходзяць свой апошні прытулак у брудзе на звычайным сметніку. Вядома, здараецца рознае: у некага памяраюць блізкія, пакідаючы дзясяткі кніг, якія ёсць і ў спадчынніка, нехта пераязджае ў новую кватэру, і для старой бібліятэкі там не знаходзіцца месца... Але ці нагода гэта так па-варварску «ўтылізаваць» літаратуру? Ёсць цэлы шэраг спосабаў, якія могуць не толькі даць вашым кнігам новае жыццё, а і папоўніць сямейны бюджэт.**


Фота Сяргей НІКАНОВІЧА.

## Другасная сыравіна...

Пэўна, самы традыцыйны і звыклы шлях — здача ў макулатуру. Ён падыходзіць, напрыклад, для тых, хто не хоча валэндацца з асобнымі выданнямі. Толькі ў сталіцы дзейнічае амаль дзве сотні стацыянарных і мабільных нарыхтоўчых пунктаў (з поўным іх спісам можна азнаёміцца на сайце Мінгарвыканкама). Праўда, значных грошай на гэтым не зробіш. Сярэдняя цана 1 кілаграма макулатуры вагаецца ў раёне дзесяці капеек. Таму, калі кніг не так шмат, паездка ў нарыхтоўчы пункт можа быць немэтазгодны нават з эканамічнага пункту гледжання — дзеля таго, каб «адбіць» два квіткі ў грамадскім транспарце, трэба здаць не менш за дзесяць кілаграмаў паперы. З іншага боку, у такіх месцах звычайна прымаюць не толькі макулатуру, а адразу цэлы комплекс адходаў: рыззё, пластык, шклабой і іншае.

Існуе таксама некалькі варыянтаў для тых, хто не хоча займацца самастойнай транспарціроўкай і мае сапраўды маштабныя аб'ёмы папяровых выданняў. Напрыклад, на сайце *макулатура.бел* жыхары Мінска і бліжэйшых населеных пунктаў могуць пакінуць заяўку на самавываз непатрэбных выданняў, ды яшчэ і па «царскім» кошце — ад 12 капеек за кіло. Праўда, арганізацыя патрабуе, каб аб'ём макулатуры быў не менш за 200 кілаграмаў. На сайце papperstok.by цэны яшчэ вышэйшыя — ад 14 капеек, але прымаюць толькі ад 300 кіло.

Калі ж грашовы аспект вас зусім не хвалюе, то макулатуру можна ўтылізаваць пры дапамозе спецыяльных зялёных кантэйнераў — такія ўжо амаль паўтара года размяшчае ў спальных раёнах сталіцы ААТ «Белгіпс». Галоўная «фішка» ў тым, што выкідаць у такія сметнікі можна абсалютна любыя папяровыя і кардонныя адходы — супрацоўнікі прадпрыемства самі займаюцца іх сартаваннем. Актуальныя кнігі пасля перадаюць у сацыяльныя ўстановы, астатнее адпраўляюць на перапрацоўку. Адзінае, аб чым просяць уласнікі кантэйнераў, — перавязваць ці ўпакоўваць выданні ў цэлафан, бо здараюцца выпадкі, калі нехта па няведанні ці злым намеры выкідае ў кантэйнеры рэчы, якія могуць сапсаваць літаратуру.

## ...або крыніца ведаў?

А вось калі кнігі для вас — не проста нарэзаная папера з надрукаванымі фарбай літарамі, то варыянтаў працягу іх жыцця некалькі. Самы бескарыслівы і сучасны — «вызваліць» літаратуру шляхам буккросінгу. Рух па перадачы прачытаных кніг іншым людзям з'явіўся 15 гадоў таму і ўжо перажыў свой пік, але дагэтуль застаецца папулярным. Ідэя ў тым, што гаспадар рэгіструе непатрэбную яму кнігу на сайце (у Беларусі гэта bookcrossing.by), дзе яна атрымлівае спецыяльны нумар — BCID, які трэба пазначыць на форзацы. Пасля гэтага выданне можна пакінуць у любым грамадскім месцы, дзе яе знойдзе іншы чытач, які пазней паўторыць працэдуру. А першапачатковы гаспадар зможа адсочваць яе падарожжа і нават знаёміцца з тымі, каму кніга трапіла ў рукі.

Мяркуючы па згаданым сайце, толькі цяпер у Мінску гэтак вандруе амаль тры тысячы выданняў. Але калі вы спыніцеся якраз на варыянце з буккросінгам, майце на ўвазе, што тэлефонныя даведнікі, падручнікі па гісторыі КПСС і іншыя кнігі падобнага кшталту наўрад ці будуць карыстацца папулярнасцю.

Калі ж расставацца з літаратурай бясплатна не хочацца, то вам прамая дарога ў букіністычныя крамы і аддзелы. У такіх месцах кнігі ацэняць, выставяць на продаж, а пасля рэалізацыі частку прыбытку (звычайна 70%) аддадуць былому гаспадару. Праўда, возьмуць на гандлёвыя паліцы далёка не ўсё. Як нам патлумачылі ў букіністычным аддзеле Дома кнігі «Веды», ахвотным трэба папярэдне скласці спіс усёй літаратуры, якую яны хочуць прадаць, і прыйсці з ім у краму. Спецыялісты выберуць кнігі, у якіх ёсць шанц знайсці новага гаспадара, і толькі потым выданні прымуць да рэалізацыі. Кошт залежыць пераважна ад стану кнігі.

У першую чаргу ў букіністычныя аддзелы нясуць падпісныя шматтомныя выданні, за іх можна атрымаць больш-менш сур'ёзныя грошы. Так, напрыклад, збор твораў Чэхава ў 12 тамах 1964 года ці 9-томнік Буніна 1965 года ў добрым стане забяруць за 15 рублёў, 5-томнік Сервантэса 1965-га пацягне ўжо на 20 рублёў, а за заўсёды папулярнага Заля ў 26 тамах 1960 года можна атрымаць і ўсе 50. З іншага боку, некаторыя кнігі, папулярныя ў СССР, але не вельмі цікавыя цяперашняй публіцы (аўтараў кшталту Новікава-Прыбоя), наўрад ці возьмуць у букіністычных аддзел. Адзінкавыя выданні таксама прымаюць, але па меншых цэнах. Сярэдні кошт адной кнігі ў добрым стане — каля 2 рублёў.

Асобна можна весці размову пра антыкварную літаратуру. Калі раней мяжой, якая раздзяляла антыкварыят і старызну быў 1850 год, то цяпер гістарычную каштоўнасць набываюць нават кнігі, выдадзеныя да Вялікай Айчыннай вайны, сцвярджаюць у «Ведах». Калі ў вас раптам захаваліся непатрэбныя цікавыя кнігі пачатку мінулага стагоддзя — абавязкова варта паказаць іх спецыялістам у букіністычных аддзелах, бо за некаторыя можна атрымаць вельмі немалую ўзнагароду.

Апошні, але самы меркантыльны спосаб — продаж кніг праз інтэрнэт-аўкцыёны. У такім выпадку вам не прыйдзецца дзяліцца грашыма з пасярэднікамі, але і займацца ўсімі пытаннямі давядзецца самастойна. Ці сур'ёзным будзе выйгрыш у грашах? Далёка не факт. Напрыклад, самая папулярная стартавая стаўка на выданні другой паловы мінулага стагоддзя — 50 капеек. Зноў жа, далёка не ўсе такія лоты адгукаюцца пакупнікі. Затое новыя ці амаль новыя кнігі тут можна прадаць даволі выгадна — амаль па магазінных цэнах. Так, толькі 12 кніг з 25-томнага збору твораў Уладзіміра Караткевіча 2012 года выстаўлены на продаж за 240 рублёў. 6 кніг з «Залатой калекцыі беларускай літаратуры» ў 50 тамах — за 80. Пэўна, найвялікшым попытам на такіх пляцоўках карыстаецца ўжо згаданая антыкварная літаратура. Так, напрыклад, за псалтыр эпохі расійскага імператара Мікалая І у «прымальным» стане просяць 37 рублёў, за «Пачатковую алгебру» 1970 года — 50 рублёў, столькі ж за асобны 5 том слоўніка Бракгаўза і Эфрона 1891 года...

Што рабіць з непатрэбнай літаратурай — выбар кожнага. Але перад тым, як апошні раз зняць кнігу з паліцы, заўсёды варта праверыць яе на прадмет грашовых «укладаў». А яшчэ лепш — пагартаць старонкі і перапытаць сябе, ці сапраўды вы гатовы расстацца з тым, што некалі так дорага даставалася?

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## УВАГА, ПРАМАЯ ЛІНІЯ!

У наступны аўторак, 2 жніўня, пройдзе «прамая лінія» з **намеснікам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аленай Іванаўнай РАДЧАНКАЙ**. Задаць пытанні па тэме ў гэты дзень можна будзе з 10 да 12 гадзін па нумары 284 89 64.

## САБРАНЫ ДРУГІ МІЛЬЁН ТОН ЗБОЖЖА

**Як паведамляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, гэты рубеж айчынныя гаспадаркі пераадолелі ўчора.**

На першым месцы па сабраным ураджаі па-ранейшаму застаюцца аграрыі Гомельшчыны. Там намалацілі ўжо больш за 515 тысяч тон. Крыху адстае Мінская вобласць: у прысталічным рэгіёне ўбралі 497 тысяч тон. Не нашмат адстае і Брэстчына, дзе сабралі 472 тысячы тон збожжа. А вось у іншых рэгіёнаў харчовая статыстыка пакуль больш сціплая. Прамежкавы вынік аграрыяў Гродзеншчыны — 277 тысяч тон. Гаспадаркі Магілёўскай вобласці запісалі на свой рахунак 181 тысячу тон збожжа. Віцебская вобласць, якая традыцыйна пачынае жніво апошняй, цяпер мае ў распараджэнні 67,7 тысячы тон. Ураджайнасць збожжа складае 34,4 цэнтнера з гектара. Гэта больш за леташні паказчык на 2,3 ц/га.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

## ПАКУЛЬ БЕЗ КАМІСІІ

Беларусбанк прадоўжыў да 1 кастрычніка тэрмін бясплатных наяўных плацяжоў

**Нядаўна Беларусбанк паведамляў пра тое, што з першага жніўня будзе ўводзіцца камісія за аплату гатоўкай. Яна складзе адзін дэнамінаваны рубель. У канчатковым выніку падобны крок вырашылі адкласці на некалькі месяцаў.**

У банку паведамілі, што камісія будзе прымацца з 1 кастрычніка. За гэты час кліенты банка могуць асвоіць працу з інфакіёскамі і навучыцца карыстацца каналамі дыстанцыйнага абслугоўвання, каб мець альтэрнатыву аплаты гатоўкай з камісіяй.

А вось плату за прагляд у банкаматах іншых банкаў балансу на картцы 1 жніўня Беларусбанк, згодна з размешчанай на яго сайце з 1 жніўня інфармацыяй, уводзіць. У тэрміналах Белаграпрамбанка, БПС-Сбербанка і Белінвестбанка ў залежнасці ад валюты рахунку плата складзе 10 капеек / $0,1 (еўра) / 5 расійскіх рублёў, у тэрміналах іншых банкаў-рэзідэнтаў — 50 капеек / $0,3 (еўра) / 20 расійскіх рублёў, у тэрміналах банкаў-нерэзідэнтаў — Br1 / $0,5 (еўра) / 35 расійскіх рублёў.

У Беларусбанку звяртаюць увагу, што зняцце наяўных грашовых сродкаў у банкаматах Белаграпрамбанка, БПС-Сбербанка, Белінвестбанка ажыццяўляецца без спагнання ўзнагароджання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ЭКАЛАГІЧНА І ЭФЕКТЫЎНА

**У раёне былога аэрадрома ў Шчучыне ўвялі ў эксплуатацыю сонечную электрастанцыю магутнасцю 2,5 МВт.**

Гэта ўжо другая станцыя па выкарыстанні энергіі сонца ў раёне. Першая, магутнасцю 1,26 МВт, эфектыўна працуе ў вёсцы Ражанка. Не менш карысная будзе і электрастанцыя ў Шчучыне, якую на плошчы 5 гектараў пабудавалі сумесна з нямецкімі спецыялістамі дзякуючы інвестыцыям у суме больш як 52 мільярды недэнамінаваных рублёў. Згодна з ацэнкай **дырэктара ТАА «ЛагАл-Энерга» Аляксандра АЛЕЙНІКАВА**, штогод яна можа выпрацоўваць каля 2,75 мільёна кілават-гадзін электраэнергіі. Калі параўноўваць з электрастанцыяй, якая выкарыстоўвае вугаль, то для атрымання такога ж выніку неабходна спаліць 1750 тон гэтай сыравіны.

Дарэчы, Шчучыншчына будзе ўмацоўваць свае лідзіруючыя пазіцыі ў вобласці па развіцці зялёнай энергетыкі. Нядаўна на тэрыторыі раёна адвялі яшчэ два ўчасткі для будаўніцтва сонечных электрастанцый.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## У ПАМЯЦЬ АБ ШАРЛІ ДЭ ГОЛІ

**Установяць мемарыяльную дошку ў Шчучыне.**

Славуты француз Шарль дэ ГОЛЬ з ліпеня па верасень 1916 года знаходзіўся ў Шчучыне. Дакументы, якія пацвярджаюць гэта, знайшоў саветнік па эканамічных пытаннях пасольства Францыі ў нашай краіне Мішэль Канціні.

**Мішэль КАНЦІНІ і пісьменнік, гісторык Вячаслаў БАНДАРЭНКА** пабывалі ў Шчучыне, каб адшукаць месца, дзе 100 гадоў таму падчас Першай сусветнай вайны быў у палоне капітан Шарль дэ Голь, які потым стаў генералам і прэзідэнтам Францыі.

Адпаведныя звесткі ёсць у лістах французскага афіцэра Сальмона, які разам з Шарлем дэ Голем знаходзіўся ў палоне. Сальмон пісаў, што іх, 35 афіцэраў, прывезлі ў Шчучын, які знаходзіцца паміж Гродна і Лідай, і ўтрымлівалі ў двухпавярховым цагляным корпусе фабрыкі. Верагодна, гэта адзін з будынкаў, дзе цяпер размяшчаецца цэх аўтатрактарных камплектаў завода «Аўтапровад», а раней знаходзілася піларама князёў Друцкіх-Любецкіх.

**Старшыня Шчучынскага райвыканкама Сяргей ЛОЖАЧНІК** паведаміў, што на адміністрацыйным будынку завода «Аўтапровад» неўзабаве плануецца ўстанавіць мемарыяльную дошку ў памяць аб знаходжанні тут французскіх афіцэраў, сярод якіх быў Шарль дэ Голь.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіла Іванавіча ДЗЕМЧУКА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Інстытут журналістыкі БДУ выказвае глыбокія спачуванні дацэнту кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Пятру Пятровічу Жаўняровічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**